Вольга Какшынская

# Лепшыя сярод лепшых XXV Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»



Галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Сучаснае беларускае грамадства праяўляе вялікі інтарэс да сваёй гісторыі, нацыянальнай самасвядомасці, культуры, мовы, традыцый і звычаяў. У гэтых умовах дзейнасць бібліятэк па адраджэнні і захоўванні культурна-гістарычных, нацыянальных, моўных традыцый з'яўляецца прыярытэтнай.

Правядзенне прафесійнага рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» – гэта не толькі развіццё нацыянальнай культуры, прапаганда яе здабыткаў, збіранне і распаўсюджванне фальклорна-этнаграфічнай спадчыны публічнымі бібліятэкамі, але і сродак павышэння кампетэнтнасці і абмену лепшым вопытам, спосаб стымулявання інавацыйнай творчасці бібліятэчных спецыялістаў. Гэта дае магчымасць прыцягнуць увагу да бібліятэчнай прафесіі, падняць прэстыж бібліятэкараў, даць ім магчымасць праявіць свой талент.

15 мая 2017 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі былі падзведзены вынікі юбілейнага XXV Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2016 г.

Кампетэнтнае журы, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных выканаўчых камітэтаў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры», з вялікай колькасці цікавых і разнастайных па ўвасобленых ідэях работ вылучылі лепшыя.

У рэспубліканскім этапе конкурсу прынялі ўдзел 36 бібліятэк: 12 цэнтральных, 24 бібліятэкі-філіяла, у тым ліку 15 гарпасялковых і сельскіх. Але, на жаль, колькасць прадстаўленых матэрыялаў, у параўнанні з мінулым годам, скарацілася. Не ўсе бібліятэкі прадставілі лічбавыя копіі работ. Між тым алічбаваныя матэрыялы былі размешчаны ў інтэрнеце і члены журы мелі магчымасць пазнаёміцца з матэрыяламі загадзя.

Пераможцамі рэспубліканскага этапу конкурсу сталі 24 бібліятэкі, 4 бібліятэкі прадстаўлены журы да заахвочвання. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб выніках XXV Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"» – дыпломы першай, другой, трэцяй ступені і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна. Бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, атрымаюць грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь.

Увогуле конкурсныя матэрыялы характарызуюцца ідэйнай арыгінальнасцю, інфарматыўнасцю, паўнатой раскрыцця, якасцю выканання. Больш дэталёва засяродзім увагу на дасягненнях бібліятэк-пераможцаў, за якія яны атрымалі дыпломы першай ступені.

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена ў намінацыі «**За пошукавую і даследчую працу**» – 11.

Першую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала дзяржаўная ўстанова культуры «Зэльвен-





За значны ўклад у выхаваўчую работу

ская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці. Адраджэнне традыцый святкавання Ганненскага кірмашу прыцягнула цікавасць да яго гістарычных вытокаў, што падштурхнула супрацоўнікаў бібліятэкі пачаць работу па збору, выяўленні і сістэматызацыі матэрыялаў аб гэтай гістарычнай падзеі. Бібліятэкай створана хроніка правядзення свята, сабраны і сістэматызаваны дакументальныя звесткі аб яго арганізатарах і фундатарах. На аснове здзейсненай навукова-пошукавай работы падрыхтаваны: самаробная краязнаўчая кніга «История возникновения и традиции Анненской ярмарки», папяровая картатэка артыкулаў «Анненская ярмарка», бібліяграфічны паказальнік з працягам «Ганенскі кірмаш», даведнік «Ганненскі кірмаш: навукова-даследчая дзейнасць», краязнаўчы нарыс «Листая страницы эпох… История Анненской ярмарки», зборнік артыкулаў «Ганеннскі кірмаш. Мінулае, сучаснае, будучае», зборнікі вершаў «Да нас вярнуўся гонар наш – славуты Ганнескі кірмаш». Несупынна бібліятэкары вядуць даследаванні, адсочваюць усе крыніцы, дзе ідзе гаворка пра Ганненскі кірмаш, выкарыстоўваюць усе магчымасці, каб веды аб страчанай спадчыне папаўняліся з кожным годам.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі журы адзначыла Казловіцкую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Калінкавіцкага раёна» Гомельскай вобласці. Матэрыял, сабраны падчас скрупулёзнай даследча-пошукавай работы бібліятэкара, адлюстроўвае ўсе гістарычныя этапы ў развіцці вёскі Казловічы. З мэтай прадстаўлення побыту і культуры вяскоўцаў, вяртання памяці аб зямлі, якая з'яўляецца іх вытокам і калыскай, у 2016 г. у бібліятэцы створана «Этнахатка сялянскага побыту». Яна аформлена ў выглядзе старадаўняй хаты з прадметамі побыту, прыладамі працы той далёкай пары. Гэта дапамагае ўзнавіць аблічча мінулых эпох, а дакументы, фатаграфіі, успаміны землякоў раскрываюць гісторыю развіцця вёскі. Этнахатка налічвае звыш 300 экспанатаў, якія выклікаюць вялікую цікавасць у чытачоў і ўдзячнасць бібліятэкару – стваральніку этнахаткі.

У намінацыі **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** бібліятэкамі было даслана дзевяць работ.

Першая прэмія сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызначана Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы» Брэсцкай вобласці за папулярызацыю беларускай кнігі ў дзіцячым асяроддзі пасродкам інавацыйных форм масавай работы. У матэрыяле прадстаўлены рэалізаваны бібліятэкай крэатыў-праект «Вясёлка юбілейных падзей», асноўнай задумкай якога з'яўляецца адзначэнне юбілеяў пісьменнікаў ці кніг у бібліятэцы цікавымі, нестандартнымі мерапрыемствамі, у аснове якіх – камп'ютарныя тэхналогіі. Пазнаёміць з творамі пісьменніка падчас спектакля лялечнага тэатра, перагарнуць старонкі яго жыцця з дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі, зацікавіць сюжэтам твора, чытаючы ўслых займальныя ўрыўкі, выклікаць цікавасць да герояў кніг праз творчыя майстар-класы і конкурсы ілюстрацый. У выніку ў бібліятэкараў атрымалася зацікавіць юных чытачоў, выклікаць у іх яркія ўражанні, сфарміраваць станоўчую матывацыю да чытання беларускай кнігі, павагу і любоў да роднай мовы.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала Чэрнеўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Дрыбінская бібліятэчная сетка» Магілёўскай вобласці. З году ў год бібліятэка плённа працуе ў напрамку нацыянальнага адраджэння, выхавання любові і павагі да роднага краю, цікавасці да вывучэння гісторыі сваёй вёскі. З 2014 г. бібліятэкай паспяхова рэалізуецца мэтавы праект «Беларускія канікулы ў сельскай бібліятэцы». Праект прадстаўляе комплекс напрамкаў і мерапрыемстваў па арганізацыі занятасці, адпачынку дзяцей і падлеткаў у цеснай сувязі з народнымі традыцыямі, якія ўжываюцца ў гэтай мясцовасці. Больш за 100 арыгінальных экспанатаў вясковага побыту сабрана ў этнаграфічным пакоі бібліятэкі «Ад родных вытокаў», распрацаваны і ўкараняецца ў жыццё краязнаўчы маршрут «Сцяжынкамі роднага краю».

У намінацыі **«За падтрымку і развіццё чытання»** бібліятэкі прадставілі на разгляд журы дзевяць работ.



За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы



За пошукавую і даследчую працу

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла дзяржаўная ўстанова культуры «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік» Мінскай вобласці. Бібліятэка з'яўляецца крыніцай літаратурна-краязнаўчай інфармацыі і камунікацыйным цэнтрам літаратараў. Бібліятэкары займаюцца вывучэннем гісторыі краю і захаваннем культурных традыцый, праводзяць вялікую работу па ўшанаванні памяці выдатнай паэткі Ганны Новік, прапагандуюць творчасць мясцовых паэтаў. У бібліятэцы распрацаваны і з поспехам рэалізуецца праект «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў» (2014–2017 гг.). У рамках праекта бібліятэкары актыўна прапагандуюць творчасць мясцовых аўтараў, выкарыстоўваючы інавацыйныя формы і метады: размяшчаюць вершы паэтаў на сайце бібліятэкі, ствараюць электронныя прэзентацыі, буктрэйлеры; выдаюць і прэзентуюць зборнікі мясцовых паэтаў. За 2016 г. у Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Г. Новік выдадзена пяць зборнікаў твораў вілейскіх аўтараў. Важным дасягненнем бібліятэкі з'яўляецца стварэнне калекцыі кніг мясцовых аўтараў з аўтографамі.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк на першую прэмію журы вылучыла Салтаноўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці, якая з'яўляецца для вяскоўцаў не толькі інфармацыйна-культурным цэнтрам, але і месцам, дзе можна знайсці падтрымку творчых задумак. У сваёй рабоце бібліятэка карыстаецца інавацыйным падыходам, у аснове якога інтэрактыўныя формы правядзення масавых мерапрыемстваў: прэзентацыі кніг, хіт-парады, флэшмобы, віртуальныя турнэ, мастацкія экскурсы і інш. Усе жадаючыя з задавальненнем удзельнічаюць у занятках па бодзі-арту, майстар-класах, акцыях, прэзентацыях, выставах. Асаблівая ўвага надаецца мастацкаму афармленню памяшкання – бібліятэка выглядае як святочная пляцоўка: усюды яркія фарбы, кветкі, драпіроўкі з тканіны, казачныя персанажы. Магчымасць рэалізаваць крэатыўныя ініцыятывы дае аматарскае аб'яднанне «Авангард».

Менш за ўсё работ было прадстаўлена ў намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** – усяго сем.

Лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана Цэнтральная гарадская бібліятэка імя К. Маркса ўстановы культуры «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва». Сярод навацый бібліятэкі – дзеючы каворкінг-цэнтр, шырокая праграмна-праектная дзейнасць: міжнародны інтэрнэт-праект «Мая любімая кніга», сацыяльна-інавацыйны праект «Мабільная бібліятэка», пілотны віртуальны праект «Беларусь гасцінная», сумесны творчы праект з Магілёўскім абласным музеем Масленікава «Музей і бібліятэка – захавальнікі духоўнай спадчыны», крэатыў-праект «Арт-вакно як аб'ект культурнай прасторы бібліятэкі», інавацыйны праект «Класіка ў новым фармаце», літаратурны праект-марафон «Чытаем байкі Кандрата Крапівы разам», праект «Моладзь у руху, або Жыві ў рытме свайго горада», пілотны праект «75 секунд пра подзвіг», праграма «Бібліятэка – інфармацыйны цэнтр міжнацыянальных культур». Упершыню ў 2016 г. у практыцы бібліятэкі выкарыстана тэхналогія падзейнага маркетынгу, што стала эфектыўным інструментам прасоўвання бібліятэкі і яе рэсурсаў, стварэння пазітыўнага іміджу. Розныя па форме і зместу мерапрыемствы праходзяць у межах шэрагу клубаў і аматарскіх аб'яднанняў бібліятэкі – у клубе аматараў гісторыі «Магіляўчане», літаратурна-мастацкім клубе «Суразмоўца», англійскім клубе «Communication Club», аматарскім аб'яднанні – рэтра-кіназале «Кінакласіка».

Першай прэміяй сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк адзначана Агарэвіцкая сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці. Бібліятэка прызнана лепшай за выкарыстанне нетрадыцыйных форм работы па папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў, рэалізацыю інавацыйна-творчых праектаў, стварэнне і ўжыванне мультымедыйных рэсурсаў. Дзейнасць бібліятэкі вызначае пастаянная і мэтанакіраваная работа па збору, захаванню і папулярызацыі матэрыялаў аб гістарычным мінулым і сучаснасці вёскі, культурнай спадчыны краю, аб жыцці і працоўных здабытках ураджэнцаў агарэвіцкай зямлі. Так, бібліятэчны праект «Гісторыя вёскі Агарэвічы з бібліятэчнай паліцы ў сучасны фармат» раскрывае старонкі гісторыі і культуры вёскі ад А да Я, апавядае пра людзей, якія сваімі баявымі і працоўнымі подзвігамі стварылі гэтую гісторыю. Мультымедыйная энцыклапедыя – вынік краязнаўчага пошуку, знаходак, сустрэч бібліятэкараў на працягу дзесяткаў гадоў, якія пастараліся раскрыць як мага паўней гісторыю вёскі і яе людзей.

Вынікі конкурсу сведчаць аб невычэрпным патэнцыяле работы бібліятэк па фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, распаўсюджванні ідэі беларускасці, прапаганды нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры. І сёння можна з упэўненасцю сказаць, што конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» будзе працягвацца і пашырацца, спрыяць больш якаснай рабоце бібліятэк, стымуляваць іх да рэалізацыі новых задумак і планаў, пошуку інавацыйных і цікавых сваім чытачам форм работы.

**Summary**

An overview of the libraries that won the competition in 2016.